# Горячий привет участникам Международной конференции!

Сегодня начинает свою работу Международная конференция "АЛГЕБРА И КИБЕРНЕТИКА", посвященная памяти академика С.А.Чунихина и 90-летию со дня его рождения. Ее организаторами стали Министерство образования и науки Республики Беларусь, Гомельский государственный университет им.Ф.Скорины, Белорусский государственный университет транспорта, Гомельский филиал Института математики АНБ, Белорусское агентство научно-технической и деловой информации. В конференции принимают участие ведущие ученые СНГ и стран дальнего зарубежья по следующим научным направлениям:

1. Алгебра.
2. Теория автоматов.
3. Математическое моделирование.
4. Информатика.
5. Экономика информационных технологий.

Конференция будет работать на протяжении четырех дней.


ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт



№ 13(895) | АЎТОРАК, 19 верасня 1995 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная


## МАЦНЕЦЬ СУСЕДСКАМУ СУПРАЦОЎНІЦТВУ

На працягу чатырох дзён у Сілезскім політэхнічным універсітэце /г.Глівіцэ/ Рэспубліке Польшча праходзіла міжнародная канферэнцыя па матэматыцы. У ёй прынялі ўдзел вучоныя з Германіі, Канады, Венгрыі, Украіны, Беларусі і іншых краін. На пленарным пасяджэнні на працягу гадзіны з навуковым дакладам на англійскай мове выступіў рэктар нашага універсітэта доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар Л.А.Шамяткоў.

Распрацаваны праект дагавора аб супрацоўніцтве паміж Сілезскім політэхнічным універсітэтам і Гомельскім дзяржуніверсітэтам, пасля падпісання якога значна пашырацца і паглыбяцца навуковыя сувязі паміж гэтымі вышэйшымі навучальнымі ўстановамі суседніх краін.

## ПРЫСВЕЧАНА ДНЮ БЕЛАРУСКАЙ ПІСЬМЕННАСЦІ І ДРУКУ

Сёлета гэта свята адзначалася ў другі раз. Цэнтрам яго правядзення стаў старажытны Тураў. Сярод шматлікіх мерапрыемстваў была навукова-практычная канферэнцыя "Роля Турава ў духоўнай культуры славянскага свету". Яна адбылася 2-га верасня. Удзельнікі канферэнцыі заслухалі 11 выступленняў вучоных, а таксама выконваючага абавязкі старшыні Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў, прэзідэнта Таварыства імя Кірылы Тураўскага В.С.Сяліцкага, настаўніцы гісторыі школы N 1 г.п.Турава М.М.Юрэвіч, дырэктара Веткаўскага музея народнай творчасці Г.Р.Нячаевай.

"Спадчына Кірылы Тураўскага і Францішка Скарыны ў дзейнасці Гомельскага дзяржаўнага універсітэта" — тэма выступлення на канферэнцыі прарэктара ГДУ па вучэбнай рабоце кандыдата філалагічных навук М.М.Воінава.

## РАСПРАЦОЎВАЕЦЦА КАЛЕКТЫЎНЫ ДАГАВОР

На першым у новым навучальным годзе пасяджэнні прафкома асноўным на парадку дня было пытанне аб калектыўным дагаворы паміж адміністрацыяй, прафсаюзнымі камітэтамі супрацоўнікаў і студэнтаў. Яго праект па разделах зачытаў член прафкома У.П.Балога. Пры абмеркаванні ў праект унесены папраўкі і дапаўненні і пасля дапрацоўкі ён будзе прадстаўлены на зацвярджэнне.

## *ВІНШУЕМ!*

***Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты філалагічнага факультэта горача віншуюць загадчыка кафедры беларускай літаратуры доктара філалагічных навук ШТЭЙНЕРА Івана Фёдаравіча з нагоды прысваення яму Атэстацыйнай калегіяй Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь вучонага звання прафесар.***

## НА ВУЧОБУ Ў ФРАНЦЫЮ

Другі год запар наш універсітэт накіроўвае лепшых студэнтаў эканамічнага факультэта на вучобу ў Францыю — у прафесіянізаваны інстытут "Інжынерыя менеджмента" універсітэта Овернь-Клермон-1 тэрмінам на 10 месяцаў. Сёлета гэтага ганаровага права ўдастоены трэцякурсніцы Г.Кожанава, В.Белавусава, Ж.Іванова, А.Яўменава. Усе яны добра валодаюць французскай мовай і маюць у залікоўках выдатныя адзнакі па ўсіх вывучаемых дысцыплінах.

## ПАСТУПІЛІ Ў ГДУ І ПАЕХАЛІ ... У ЗША

Павел Рап"еўскі і Таццяна Логвінава сёлета закончылі гомельскую СШ №10 з залатымі медалямі і паступілі на вучобу ў наш універсітэт. Павел — на спецыяльнасць "Правазнаўства " гісторыка-юрыдычнага, а Таццяна — на спецыяльнасць "Англійская мова" філалагічнага факультэтаў. Але сярод першакурснікаў ГДУ іх сёння не ўбачыш. Яны — у акадэмічных водпусках, узяць якія давялося па вельмі прыемных акалічнасцях.

У адпаведнасці з пагадненнем паміж Амерыканскім Саветам па супрацоўніцтву ў галіне адукацыі і вывучэнню моў (АККСЕЛС) і Міністэрствам адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь сёлета ўпершыню быў праведзены конкурс для беларускіх грамадзян на права атрымання стыпендый са сродкаў Інфармацыйнага Агенцтва ЗША і вучобы ў гэтай краіне ў 1995-96 навучальным годзе. Іменна Павел і Таццяна сталі пераможцамі гэтага конкурснага адбору і цяпер жывуць у амерыканскіх сем"ях, з зацікаўленасцю ўдасканальваюць веды па англійскай мове, паглыбляюць свой агульнаадукацыйны ўзровень.

**Б.ВАЛОДЗІН.**

# І СОНЦА ЗАЗЗЯЛА НА РАДАСЦЬ

## З пасвячэння першакурснікаў у студэнты

Апошні жніўеньскі дзень, якім завяршалася працяглае спякотнае лета, выклікаў занепакоенасць. Падуў парывісты вецер, хмарамі завалакло ўсё неба, з самага ранку з перапынкамі ішоў дождж. Рэзкая перамена надвор"я пагражала ўрачыстаму правядзенню Дня ведаў, традыцыйнаму ў нашым універсітэце пасвячэнню першакурснікаў у студэнты.

Але, як жартуюць, хтосьці нібы змілаваўся ў "нябеснай канцылярыі". За ноч ўсё перамянілася і першавераснёўскі ранак, на здзіўленне, выдаўся надзвычай ціхім, сонечным і цёплым. Гэта ўзбадзёрыла, прыўзняло настрой ва ўсіх, для каго пачынаўся новы навучальны год, асабліва ў першакласнікаў і першакурснікаў.

Адной з самых ажыўленых у Гомелі 1-га верасня стала пляцоўка перад вучэбным корпусам №1 нашага універсітэта. Ужо а восьмай гадзіне тут пачалі збірацца па-святочнаму апранутыя, з асветленымі радасцю тварамі юнакі і дзяўчаты, якія ў другой палове ліпеня прайшлі нялёгкія выпрабаванні і на конкурснай аснове атрымалі права набываць абраныя спецыяльнасці ў вядучай вышэйшай навучальнай установе Беларускага Палесся.

Завіталі на ўрачыстасць, каб яшчэ раз парадавацца за сваіх дзяцей, многія бацькі першакурснікаў. Павіншаваць іх са знамянальнай у жыцці падзеяй прыйшлі шаноўныя госці, кіраўнікі універсітэта, дэканы, загадчыкі кафедр, выкладчыкі.

"Пожиточьны же суть сие чести всякому человеку, мудрому и безумному, богатому и вбогому, младому и старому, наболей тым, они же хотят имети добрые обычаи и познати мудрость и науку..." -- так казаў у свой час слынны сын беларускага народа, першы беларускі асветнік Францыск Скарына.

... Гучаць фанфары. Як толькі яны заціхаюць, да мікрафонаў падыходзяць вядучыя ўрачыстасці і прадстаўляюць слова рэктару доктару фізіка-матэматычных навук, прафесару, члену-карэспандэнту АНБ, заслужанаму дзеячу навукі Рэспублікі Беларусь Л.А.Шамяткову, які аб"яўляе адкрытым Дзень ведаў новага навучальнага года.




Ля мікрафона -- рэктар універсітэта Л.А.Шамяткоў

Гучыць гімн студэнтаў "Гаўдэамус".

Леанід Аляксандравіч горача віншуе першакурснікаў, усіх прысутных са святам, гаворыць аб тым пачэсным месцы, якое займае Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны ў сістэме вышэйшай школы нашай рэспублікі. Сведчаннем таму з"яўляецца стварэнне пры ГДУ спецыялізаваных саветаў па абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый. Пачатак пакладзены. У ліпені бягучага года доктарскую дысертацыю па матэматыцы паспяхова абараніў дацэнт С.Ф.Каморнікаў.

У хуткім часе, а дакладней у лістападзе, пры нашым універсітэце будзе адкрыты беларуска-французскі Інстытут кіравання. Гэта -- адзін з фактараў міжнароднага прызнання ГДУ, росту яго прэстыжу.

Л.А.Шамяткоў выказаў першакурснікам найлепшыя пажаданні -- настойліва набываць неабходныя веды для будучай прафесіянальнай дзейнасці, ва ўсім займаць актыўную грамадзянскую пазіцыю, быць дысцыплінаванымі, працягваць і памнажаць лепшыя традыцыі універсітэта.

Пад дружныя апладысменты Леанід Аляксандравіч уручыў першакурснікам сімвалічны студэнцкі білет. З відавочнай радасцю і хваляваннем яго ўзялі ў свае рукі Ірына Лабовіч з гісторыка-юрыдычнага і Вячаслаў Папруга з матэматычнага факультэтаў.

З вялікай увагай былі выслуханы і цёпла ўспрыняты шчырыя пажаданні першакурснікам старшыні Гомельскага аблвыканкома П.У.Шыпука.

-- "Без мудрости и без добрых обычаев не ест мощно почстиве житие людям посполите на земли..." -- скарынаўскімі словамі пачаў сваё выступленне на ўрачыстай лінейцы доктар філалагічных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь У.В.Анічэнка. -- Прысваенне нашаму універсітэту імя Францыска Скарыны, -- гаварыў шырока вядомы мовазнаўца, -- надало яму міжнародны статус.



Выступае старшыня аблвыканкома П.У.Шыпук

Уладзімір Васільевіч таксама выказаў у адрас сённяшніх першакурснікаў свае самыя добразычлівыя пажаданні па ўваходжанню ў краіну ведаў.

Ад імя старшакурснікаў новае папаўненне універсітэта віншаваў студэнт 5-га курса фізічнага факультэта імянны стыпендыят Сяргей Сухараў. Ён заклікаў першакурснікаў не палохацца ніякіх цяжкасцей, адносіцца да вучобы адказна і з поўнай рэалізацыяй сваіх здольнасцей і магчымасцей. І поспех прыйдзе абавязкова.

Сяргей уручыў першакурсніку эканамічнага факультэта Алегу Фёдараву сімвалічны Ключ ведаў.

Зноў позіркі скіраваны на вядучых:

-- "Да совершенен будет человек в жите своем". Гэтыя словы Францыска Скарыны гучаць ва ўсіх яго трактатах і кнігах.

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта праяўляюць пастаянны клопат аб усебаковым развіцці студэнтаў: пашырэнні іх культурнага кругагляду, эстэтычным і фізічным выхаванні.

"Яко свет превышает над темности тако и мудрый над глупаго. Доконано ест сие слова моё Франциска Скорины, поведением, працею и выкладом для житие мирнаго, просвященного и быти нужнаго люду разному. Сие и ест наивысшая мудрость размышление познание самого себе".



На свяце ўзнёсла гучалі словы вядучых.

-- Зараз для вас, дарагія першакурснікі, прагучыць першы універсітэцкі званок, які запрашае вас, сябры, у наша студэнцкае жыццё!

Званок даюць студэнтка 1-га курса філфака Вольга Назарава і выпускнік універсітэта Сяргей Дзюбо.

У добры шлях, дарагія першакурснікі!

Пасля святочнай урачыстасці першакурснікі разышліся па сваіх факультэтах на першую ў жыцці універсітэцкую лекцыю.

**Б.ВАЛОДЗІН.**

**Фота М.ВЫСОЦКАГА.**



# НАША ПЕРШАЯ ПРАКТЫКА

Пачыналася яна, як і ўсё новае, з мноства няясных пытанняў: куды ісці, як сябе паводзіць, дзе знайсці той матэрыял, які неабходна прадставіць да справаздачы... А справаздача... На ўсё гэта было неабходна знайсці адказы за месяц практыкі.

Але варта было ўзяцца за справу сур"ёзна, і ўсё адразу пачало станавіцца на сваё месца, як кавалкі галаваломкі. І першы вывад, да якога я прыйшла, што галоўнае ў гэтай справе -- упэўненасць, што ў мяне ўсё атрымаецца. А яшчэ на маім шляху сустракаліся добразычлівыя людзі, якія ведаюць сваю справу і заўсёды гатовы дапамагчы і растлумачыць незразумелае, толькі задавай пытанні. А іх было вельмі шмат і самых разнастайных.

Такім чынам, усё па парадку.

Перш за ўсё трэба сказаць, што практыка прававедаў пасля 2-га курса складаецца як бы з дзвюх частак: дзяржаўнай і гаспадарча-прававой.

Дзяржаўную практыку мне пашчасціла праходзіць у Гомельскім аблвыканкоме пад кіраўніцтвам начальніка ўпраўлення юстыцыі Я.К.Аземшы і яго намесніка Г.І.Кастко. Дзякуючы гэтым двум прафесіяналам сваёй справы, якія не толькі мудра арганізавалі нашу практыку так, што мы змаглі не толькі пазнаёміцца са структурай аблвыканкома, вывучыць работу многіх яго аддзелаў, але нават і пабываць на семінарах-лекцыях курсаў павышэння кваліфікацыі для юрысконсультаў. Гэта было для нас вельмі карысным, таму што мы змаглі даведацца, як жа прымяняецца грамадзянскае права на практыцы, а значыць, мы маглі скласці граматныя справаздачы. Асабіста мне Якаў Кірылавіч і Георгій Іванавіч сваімі парадамі дапамаглі справіцца з "нялёгкімі" абавязкамі старасты групы. За гэта ім вялікі дзякуй.

Другая частка нашай практыкі была не менш захапляльнай і пазнавальнай. Некалькі маіх сакурснікаў і я разам з імі праходзілі яе ў вытворча-гандлёвай фірме "8 Сакавіка". Галоўная асаблівасць гэтай практыкі, на маю думку, заключалася ў тым, што яна абсалютна адрознівалася ад таго, з чым мы паспелі ўжо азнаёміцца. Але і тут нам зноў пашанцавала на добрых людзей і прафесіяналаў сваёй справы, якія, нягледзячы на сваю занятасць работай, знаходзілі для нас хвілінкі, каб адказваць на нашы надакучлівыя, а можа нават і наіўныя пытанні. Асабліва хочацца падзякаваць начальніка юрбюро фірмы Л.Н.Кулініч, бо менавіта з яе дапамогай мы змаглі падшыць да нашых справаздач неабходныя дакументы і выканаць індывідуальнае заданне, якое нам здавалася непасільным.

Як вядома, у студэнта ў час практыкі бываюць два кіраўнікі: адзін ад прадпрыемства або арганізацыі, а другі -- ад універсітэта. Нашым добразычлівым апекуном і ангелам-захавальнікам на працягу ўсяго месяца была наша выкладчыца С.П.Кацуба, якой давялося пераадолець нямала кіламетраў па горадзе, каб прыглядзець за "сваімі шматлікімі дзецьмі", якія праходзілі практыку ў самых розных раёнах г.Гомеля. І ўсюды яна замаўляла за нас добрае слова, падбадзёрвала нас, усяляла ўпэўненасць, каб мы не разгубіліся ў патоку новай інфармацыі.

Канешне, гэта практыка дала нам толькі невялікую магчымасць убачыць нашу будучую прафесію зблізку, як кажуць, "памацаць яе сваімі рукамі". Камусьці яна ўжо зараз дапаможа зрабіць свой выбар -- вызначыць напрамак ў сваёй будучай рабоце, а некаму проста дасць стымул шукаць і спазнаваць штосьці новае.

**Алена КАДОЛ,**
**студэнтка III курса гісторыка-юрыдычнага факультэта.**

К 90-летию со дня рождения

# СЕРГЕЙ АНТОНОВИЧ ЧУНИХИН И ГОМЕЛЬСКАЯ АЛГЕБРАИЧЕСКАЯ ШКОЛА



**21**-го сентября 1995 года исполняется 90 лет со дня рождения выдающегося математика-алгебраиста, академика Академии наук Беларуси, заслуженного деятеля науки, доктора физико-математических наук, профессора Сергея Антоновича Чунихина.

Воспитанник Московского государственного университета им.М.В.Ломоносова, С.А.Чунихин в студенческие годы имел возможность слушать лекции крупнейших математиков того времени. Среди его учителей можно назвать такие имена как Н.Н.Лузин, А.Я.Хинчин, Д.Ф.Егоров. После окончания МГУ он был оставлен аспирантом у известного советского ученого О.Ю.Шмидта, который, кстати, являлся уроженцем Беларуси.

" 2-го марта 1936 г. при Математическом институте им. В.А.Стеклова АН СССР состоялась защита С.А.Чунихиным докторской диссертации на тему: "О подгруппах, особенно инвариантных, конечной абстрактной группы". Оппонентами были академики О.Ю.Шмидт и Б.Н.Делоне. Названная диссертация посвящалась весьма трудным вопросам теории групп, а именно выяснению условий, при которых существуют те или другие виды подгрупп в данной группе. Здесь С.А.Чунихиным был получен ряд тонких критериев. Так журнал "Успехи математических наук" /выпуск II, 1936 г., с.291/ возвестил математической общественности о появлении нового имени в алгебре -- ученого, ставшего впоследствии одним из корифеев советской школы теории конечных групп.

В своей работе в высшей школе, которую С.А.Чунихин начал в 1930 году на кафедре алгебры МГУ, он разделял педагогические принципы одного из своих учителей -- академика Н.Н.Лузина, о лекциях которого всегда вспоминал с восхищением: образность, забота о расчленении научных рассуждений на элементарные акты, строгая системность, отсутствие ложной "ученой" аффектации.

В 1953 году по предложению своего учителя академика О.Ю.Шмидта С.А.Чунихин переехал на работу в Гомель, в только что открывшийся Белорусский институт инженеров железнодорожного транспорта, где стал заведующим кафедрой высшей математики, и был тогда первым в Белоруссии доктором наук в области математики. Именно с этого времени начал работать гомельский алгебраический семинар, за короткое время ставший известным не только в стране, но и за рубежом.

В конце 60-х и начале 70-х годов благодаря плодотворным исследованиям Л.А.Шеметкова -- одного из ярких учеников С.А.Чунихина -- в рамках семинара начинает развиваться новое научное направление -- теория формаций алгебраических систем.

В 1959 году благодаря усилиям С.А.Чунихина в Гомеле было открыто отделение Института математики АН БССР, в 1964 году он основал кафедру алгебры и теории чисел в Гомельском désинституте и был ее первым заведующим. С.А.Чунихин является одним из активных инициаторов открытия в 1969 г. в г.Гомеле государственного университета.

В октябре 1985 года Сергея Антоновича не стало. Среди его гомельских учеников -- 4 доктора и 26 кандидатов физико-математических наук, в том числе Л.А.Шеметков -- ректор ГГУ, член-корреспондент Академии наук Республики Беларусь, доктор наук, профессор, заслуженный деятель науки Беларуси; Э.М.Пальчик -- доктор наук, профессор, заведующий кафедрой Новополоцкого госуниверситета; В.А.Ведерников -- доктор наук, профессор, заведующий кафедрой Брянского педагогического университета, С.А.Русаков, заведующий кафедрой высшей математики Белорусского государственного университета транспорта, профессор и другие.

## СТРОКИ О С.А.ЧУНИХИНЕ ИЗ ГАЗЕТНЫХ ПУБЛИКАЦИЙ

"... С 8 по 18 мая в городе Риге в актовом зале Латвийского государственного университета им.П.Стучки встречались ученые-алгебраисты, чтобы поделиться новыми достижениями в своей науке. Это собрание скромно называлось "Всесоюзный коллеквиум по общей алгебре", но, по существу, оно было Всесоюзным съездом алгебраистов. Здесь мы могли видеть тех, кто своими трудами внёс большой вклад в развитие алгебры в нашей стране. Это -- академик А.И.Мальцев, член-корреспондент АН СССР Д.К.Фадеев, академик АН БССР С.А.Чунихин, профессоры П.Г.Канторович, С.Н.Черников, авторы пособий для высших учебных заведений, школьных учебников, программ Е.С.Ляпин, О.Н.Головин.

Всего в работе конференции принимали участие свыше 300 алгебраистов. Одной из многочисленных была и гомельская делегация, которая представляет ведущую в стране школу теории конечных групп.

На пленарном заседании, которое посвящалось теории групп и проходило под председательством академика-гомельчанина С.А.Чунихина, с обзорным докладом выступил научный сотрудник Гомельской лаборатории теории конечных групп Л.А.Шеметков. Он рассказал о достижениях нашей алгебраической школы за последнее время. Этот доклад вызвал живой отклик у участников конференции.

Многие делегации высказались за проведение следующего Всесоюзного съезда алгебраистов в Гомеле. Эти пожелания были настолько многочисленными, что на заключительном заседании академику С.А.Чунихину пришлось выступить с рассказом о нашем городе".

**/Из публикации "Впечатления от конференции - -волнующие", газета "Гомельская праўда" за 30 мая 1967 г./.**



**Рига, май 1967 г. С.А.Чунихин со своими учениками**

"...Тридцать лет назад, в один из последних октябрьских дней, коллектив Московского университета тепло поздравил своего молодого коллегу -- 29-летнего ученого С.А.Чунихина с присвоением ему звания профессора. После окончания МГУ молодой ученый работал сначала в институте сооружений ВСНХ СССР, где занимался вопросами рассчета рамных конструкций. Однако вскоре алгебраические интересы стали для Сергея Антоновича преобладающими и он переключился на изучение теории групп.

В этом году из печати вышла книга Сергея Антоновича "Подгруппы конечных групп". Результаты, достигнутые профессором Чунихиным, принесли ему широкую международную известность ведущего ученого в области изучения конечных групп".

**/Из публикации "Влюблённый в науку", газета " Гомельская праўда" за 1 ноября 1964 г./.**

"... В самом центре Гомеля, на обрамленном зеленью здании отчетливая вывеска: "Институт математики АН БССР. Лаборатория теории конечных групп". Здесь уже 10 лет работает известная в нашей стране и за ее пределами Гомельская алгебраическая школа, которой руководит заслуженный деятель науки БССР, академик АН БССР, доктор физико-математических наук, профессор Сергей Антонович Чунихин.

Сотрудниками лаборатории и ее воспитанниками получены новые глубокие научные результаты, изложенные в многочисленных журнальных статьях и в двух монографиях. Одна из них -- монография С.А.Чунихина -- является собранием его избранных трудов, она переиздана за рубежом на английском языке. Многие результаты труда сотрудников лаборатории переведены на английский, немецкий, итальянский языки.

За период существования лаборатории были подготовлены 20 кандидатских диссертаций. Успешно защитил докторскую диссертацию старший научный сотрудник лаборатории Леонид Александрович Шеметков. Это -- несомненный научный успех 32-летнего ученого и всего коллектива лаборатории! На одном из последних заседаний семинара Леонид Александрович докладывал решение проблемы, которая, по мнению одного крупного зарубежного математика, не могла быть решена"...

**/Из публикации "Зрелость молодой лаборатории", газета "Гомельская праўда" за 3 сентября 1970 г./.**

"... Всех учеников С.А.Чунихина объединяет любовь к науке. В этом нетрудно убедиться, если побывать на заседаниях руководимого им Гомельского городского алгебраического семинара.

... Очередное заседание семинара началось необычно - - с аплодисментов. Л.А.Шеметкова -- ученика Сергея Антоновича поздравляли с присуждением ему ученой степени доктора физико-математических наук. Леонид Александрович Шеметков -- уроженец Гомеля, здесь он окончил школу, педагогический институт и поступил в аспирантуру к С.А.Чунихину. Годы учебы в аспирантуре, упорного труда в лаборатории не прошли даром. Л.А.Шеметков решил ряд крупных научных проблем и успешно защитил докторскую диссертацию. Сейчас Л.А.Шеметков -- известный советский алгебраист, его идеи и научные результаты широко используются математиками как в нашей стране, так и за рубежом.

Признанием научных заслуг С.А.Чунихина и его учеников явилось проведение в 1968 году в Гомеле Всесоюзного алгебраического съезда".

**/Из публикации "Гомельская алгебраическая школа", газета "Советская Белоруссия" за 13 февраля 1975 г./.**



**2 июля 1975 г. С.А.Чунихин и Л.А.Шеметков на Всесоюзном симпозиуме по теории групп, который проходил в Гомеле.**

**Более подробную информацию о жизни и деятельности С.А.Чунихина можно найти в "Биобиблиографическом указателе:" Сергей Антонович Чунихин", подготовленном профессором В.С.Монаховым под редакцией члена-корреспондента АНБ Л.А.Шеметкова /Гомель, 1995 г./.**

### ИЗ ПРИВЕТСТВИЯ С.А.ЧУНИХИНУ НОВОСИБИРСКИХ АЛГЕБРАИСТОВ

Семинар "Алгебра и логика" сердечно поздравляет Вас с 70-летием со дня рождения.

Вы -- один из основателей советской теории групп. Ваши прекрасные работы о $\pi$-свойствах конечных групп поставили эту область алгебры исключительно высоко, а принадлежащие Вам $\pi$-разрешимости и $\pi$-отделимости вошли в большинство современных монографий по конечным группам и стали удобным инструментом исследований во многих, подчас весьма неожиданных разделах алгебры. Такова же судьба Ваших замечательных результатов о мономиальных гомоморфизмах.

Вы -- первый в нашей стране специалист по конечным группам, этой важной и интенсивно развивающейся области современной алгебры. Ваши обзорные статьи на многие годы определили развитие ряда интересных направлений теории конечных групп. Ваши глубокие исследования условий существования подгрупп в конечных группах относятся к числу основных достижений абстрактной теории конечных групп, а идеи, заключенные в них и нашедшие свое замечательное воплощение в Вашей книге "Подгруппы конечных групп", по сей день служат источником многочисленных исследований.

**Материалы подготовлены к печати доцентом кафедры алгебры и геометрии Л.Я.Поляковым**

**На тэму дня**

# ТАК НАРАДЖАЕЦЦА БЕЛАРУСКАЯ ШМАТПАРТЫЙНАСЦЬ

Фактычнае нараджэнне партыі адбываецца на ўстаноўчым з"ездзе, і нават не пры рэгістрацыі ў Міністэрстве юстыцыі, а толькі пасля ўдзелу ў рэальнай перадвыбарнай кампаніі, пасля правядзення партыйных кандыдатаў у прадстаўнічыя органы ўлады. У гэтым сэнсе выбары 1995 года ў Вярхоўны Савет і мясцовыя органы ўлады можна лічыць датай нараджэння рэальнай шматпартыйнасці ў Беларусі. Гэтыя выбары не толькі паказалі рэальную расстаноўку палітычных сіл у рэспубліцы, але і сталі каталізатарам далейшага развіцця беларускай шматпартыйнай сістэмы. І немалую ролю ў гэтым працэсе адыгрывае тып дзейнічаюга ў нас закона аб выбарах.

Вопыт краін развітай дэмакратыі паказвае, што мажарытарная сістэма выбараў, якая прынята і ў нас, вядзе да станаўлення ў дзяржаве двухпартыйнай сістэмы. Чаму так адбываецца можна праілюстраваць на прыкладзе БНФ. У час вясенняга галасавання кандыдаты ад БНФ устойліва набіралі каля 10% галасоў. Калі б галасаванне ішло па партыйных спісах, то ў парламенце БНФ смела можна было б разлічваць на 10% месц. Але сёння гэта арганізацыя не мае ў новым парламенце ні аднаго свайго прадстаўніка, таму што ў нас для перамогі неабходна атрымаць 50% плюс 1 голас галасоў выбаршчыкаў у кожнай канкрэтнай акрузе. Пры цяперашнім настроі думак электарату перасягнуць гэты бар"ер кандыдатам ад фронту даволі складана. Гэтыя меркаванні справядлівыя і для іншых, не такіх шматлікіх і вядомых, як БНФ і ПКБ, партый. А паколькі партыя можа існаваць як палітычная арганізацыя толькі тады, калі мае сваіх прадстаўнікоў у органах улады, то перад шматлікімі беларускімі партыямі паўстала дылема: або памерці, або набыць вагу, дастатковую для заваявання 50% папулярнасці хаця б у асобных рэгіёнах.

І першымі адрэагавалі на гістарычную неабходнасць партыйнага ўзбуйнення Аб"яднаная дэмакратычная /АДПБ/ і Грамадзянская партыі. Ужо ў чэрвені гэтага года яны заявілі аб сваім намеры зліцца ў адзіную арганізацыю. І паколькі прынцыповых праграмных разыходжанняў паміж імі фактычна няма, мяркуецца, што аб"яднаны з"езд пройдзе ўжо ў верасні.

Але механічнае зліццё людскіх і фінансавых рэсурсаў яшчэ не гарантуе набыцця папулярнасці сярод выбаршчыкаў. Неабходна таксама прапанаваць і папулярную сярод насельніцтв а ідэалогію. У большасці дэмакратычных краін з пераменным поспехам пераважаюць ідэалогіі кансерватызму і сацыял-дэмакратыі. А так як у беларускім палітычным спектры ніша кансерватараў аказалася ў якойсьці меры "вакантнай", можна чакаць трансфармацыю ідэалогіі новай партыі ад ліберальна-дэмакратычнай да ліберальна-кансерватыўнай.

Услед за беларускімі лібераламі пачалі аб"яднанне і беларускія сацыял-дэмакраты -- 25 ліпеня ў доме-музеі І з"езда РСДРП Партыя народнай згоды /ПНЗ/, Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада /БСДГ/ і Партыя ўсебеларускага адзінства і згоды /УАЗ/ падпісалі Дэкларацыю аб стварэнні Сацыял-дэмакратычнага Саюза /СДС/. Па сутнасці справы толькі з гэтага моманту, можна лічыць, і пачынаецца фарміраванне сапраўднай беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі, паколькі да гэтага ПНЗ і УАЗ дэкларавалі сябе як партыя абстрактнага ідэалагічнага цэнтра, а ў БСДГ нацыянальная ідэалогія пераважала над сацыяльна-дэмакратычнай. Самавызначыўшыся як іменна сацыял-дэмакратычны цэнтр, СДС зрабіў сур"ёзную заяўку на заваяванне тых галасоў выбаршчыкаў, якія сёння належаць камуністам.

Немалаважным фактарам, які ўплывае на далейшыя шляхі беларускага партыйнага будаўніцтва, з"яўляюцца кадравыя перастаноўкі ўнутры саміх партый. Пасля няўдачы на выбарах лідэр ПНЗ Г.Карпенка падаў у адстаўку, і часова, да з"езда, яго месца заняў Леанід Сечка, які працуе ў Службе кантролю Прэзідэнта і выбраны дэпутатам новага Вярхоўнага Савета. Характэрна, што і два другіх дэпутаты ад ПНЗ у новым парламенце таксама прадстаўляюць Службу кантролю адміністрацыі Прэзідэнта. Калі ж яшчэ ўлічыць, што эканамічная неабходнасць прымусіць Прэзідэнта з ідэалагічнага пункту гледжання паправіць, а да наступных прэзідэнцкіх выбараў яшчэ патрэбна прапрэзідэнцкая партыя, што можна ў далейшым чакаць паступовага руху насустрач адзін аднаму ідэалагічных пазіцый Прэзідэнта і новага Сацыял-дэмакратычнага Саюза. У гэтай сітуацыі можна прадбачыць, што восенню Генадзь Карпенка, Віктар Ганчар і арыентаваная на іх частка ПНЗ далучыцца да новай, ствараемай АДПБ і Грамадзянскай партыі, і гэта яшчэ больш паскорыць рух СДС улева.

Такім чынам, мы становімся сведкамі ідэалагічнай і арганізацыйнай крышталізацыі беларускага палітычнага спектра, якая здольна паўплываць на зыход ужо восеньскіх паўторных выбараў.

**С.ЖАГОРАЎ,**
**ст. выкладчык кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права.**

**Цырк адкрыў новы сезон**

# АСЕННІ ЗАРАПАД

Ёсць, на шчасце, у нашым жыцці магчымасці забыцца на цяжкую паўсядзённасць і адчуць радасць у душы ад сустрэчы з любімым усімі -- і дарослымі, і дзецьмі -- цыркавым мастацтвам. На манежы адбываюцца цуды, у якія мы верым, тут захапляюць нас сваім сапраўдным майстэрствам моцныя, смелыя, спрытныя артысты, а асаблівую радасць дзецям прыносяць выступленні разнастайных прадстаўнікоў жывёльнага свету, якія пад кіраўніцтвам дрэсіроўшчыкаў могуць рабіць усё! І, канешне, дораць нам усмешкі і ўздымаюць настрой смешныя клоуны.

Чарговы цыркавы сезон адкрыўся нядаўна ў Гомельскім цырку. Праграма носіць назву "Асенні зарапад", бо тут і сапраўды сабраны зоркі расійскага і украінскага цыркаў -- лаўрэаты Усерасійскага конкурсу гімнасты на рамянях І.Шастоў і В.Дзмітрыенка; лаўрэаты Усесаюзнага конкурсу акрабаты з шастом пад кіраўніцтвам В.Ермакова; атракцыён "Змешаная група жывёл" /мядзведі, малпы, сабакі і інш./, дрэсіраваныя каровы пад кіраўніцтвам заслужанай артысткі Расіі В.Сіманавай, дрэсіраваныя ўдавы Л. і Д.Лапшыных; арыгінальныя жанглёры пад кіраўніцтвам заслужанага артыста рэспублікі Ю.Аскал-Оол і інш.

Спяшайцеся ў цырк! Ён прынясе вам мінуты радасці і весялосці.

**Т.НІКАЛАЕВА.**



*ЛЕТНИЕ ПУТЕШЕСТВИЯ*

# "ШОЛОМ АЛЕЙХЕМ! МИР ВАМ"

***Вы хотели бы побывать во время отпуска в нескольких климатических поясах, искупаться в четырёх морях, осуществить горные восхождения, попутешествовать на верблюде по пустыне? Вы хотели бы поплавать в воде, в которой невозможно утонуть, пережить уникальное состояние "хождения по воде"? Если да, то вам повезло. Есть небольшая страна, которая позволит вам это осуществить в течение вашего отпуска.***

**В**ы мечтаете прикоснуться к истокам мировой монотеистической религии? Лицезреть колыбель трех религий? Вы хотели бы совершить паломничество по христианским святыням? Отправляйтесь в эту благодатную страну. Вы пройдете по местам жизни и проповедования ветхозаветных пророков, совершите путь от места рождения Иисуса Христа до Гроба Господня и Вознесения Сына Человеческого. Вы побываете в храме, где хранится главная святыня ислама -- камень кааба, камень, на котором держится мир.

Вы попадете к стене самого древнего храма -- Стене Плача, месту, где Бог слышит каждого, куда люди со всего мира посылают факсы с просьбами и обращениями ко Всевышнему. Здесь впервые возник диалог Бога с Человеком.

Конечно же, вы догадались, о какой стране идет речь? Правильно. Это -- Израиль. Страна, которая по площади почти в три раза меньше Гомельской области, но которая непременно поразит вас своим природным, историческим и культурным многообразием: четырьмя морями /Средиземным, Красным, Мёртвым, Галилейским/, горами, пустыней, оазисами, древними городами, религиозными святынями, центрами, объединяющими христиан, мусульман, иудаистов, бахоистов. В стенах Вечного города -- Иерусалима, а также в других городах вы соприкоснётесь с культурой и традициями разных народов. Вы не заметите, как улицы еврейского квартала выведут вас в христианский, а улицы христианского квартала приведут вас в арабский, с присущим каждому из них колоритом.

Если у вас появился интерес, то я хочу предложить вам поближе познакомиться с некоторыми уникальными местами и памятниками этой земли, открывшимися мне во время летнего путешествия.

И начнем мы с Вечного города -- Иерусалима, являющегося святыней всего человечества. Для мусульман это -- Эль-Кудс, для евреев -- Ершалаим, город Мира и их столица еще со времен царя Давида, для христиан -- это место страстей и распятия Христа. Вечный город, расположенный на Иудейских холмах, насчитывает четырехтысячелетнюю историю, его прошлое характеризуется многими изменчивыми и сложными событиями.

Одной из достопримечательностей Иерусалима являются прекрасные крепостные стены из серого камня, протянувшиеся почти на четыре километра, достигающие высоты до 20 метров. Они расчленены семью большими и знаменитыми воротами: Дамасскими, Золочеными, Мусорными, Сионскими, Новыми, Воротами Ирода и Вратами Яффы.

Войдем в старый город через Мусорные Ворота и сразу окажемся у Храмовой горы. Место -- святое для христиан, иудеев и мусульман. Здесь Божий Ангел остановил Авраама, который собирался принести в жертву сына своего Исаака. Здесь находился легендарный храм Соломона, от которого не осталось никаких следов, но о котором сохранились самые тщательные и подробные описания в Книге Царств и Книге Иезекииля. Существующая сейчас часть западной стены -- это все, что осталось от Второго Храма, сооруженного Иродом Великим. Это Ха Котель Хама`арави -- Стена Плача -- символ еврейской религии, отправная точка и место паломничества для евреев мира.

Храмовая гора -- место святое также для мусульман, которые считают его третьим по значимости после Мекки и Медины, куда ходят паломники. С этим местом связана история вознесения Магомета на небо, в честь чего здесь были воздвигнуты Скалистый Купол и мечеть Эль-Акса.

От Храмовой горы через арабский квартал мы подойдем к иерусалимской улице, по которой ежедневно проходят тысячи паломников-христиан из различных стран мира с благоговейным трепетом. Via della Rosa -- улица Скорби, ведущая к Храму Гроба Господня. Это отрезок пути, который Христос прошел под тяжестью креста из Крепости Антония до Голгофы.

Храм Гроба Господня -- это самое святое место в Иерусалиме, то, которое, несомненно, взывает к самым сокровенным чувствам каждого посетителя, какого бы вероисповедания он ни был, настолько сильное впечатление производит это место, где история переплетается с легендой, где людское сострадание сливается с религиозной верой. Каждый приходящий сюда испытывает огромное волнение и смятение перед видом открывающейся перед ним церкви.

Когда-то это место находилось вне городских стен и предназначалось для исполнения смертных приговоров, и несомненно, было намного выше нынешнего места, чтобы каждый издалека, видя несчастных приговоренных, смог сделать для себя вывод и устрашился. Место это называли Голгофа от слова "гулголет", что означает черепной холм, оттого что его форма на самом деле напоминает череп. А еще и потому, что по преданию здесь был похоронен череп Адама.

Сейчас на Голгофу можно попасть поднявшись в Храме Гроба Господня по крутой лестнице. Здесь находятся две капеллы: одна -- римско-католическая, другая -- греческо-православная. Место распятия помечено серебряным знаком. Здесь находится также Камень Помазания и сама Святая Гробница. А вообще в Храме Гроба Господня 16 церквей, представляющих шесть различных конфессий.

Все христиане-паломники, посещая Иерусалим, обязательно отправляются на Масличную гору, чтобы побывать в Гефсиманском саду. И мы поступим также. Это место освящено той ночью, которую здесь провел Иисус в молении о чаше. Здесь и сейчас сад, в нем до сих пор сохранились восемь искривленных старых олив эпохи Христа. Рядом сооружена Церковь наций. В ней на полу перед алтарем лежит терновый венок из кованого железа, опоясывающий обломок скалы, на которой Иисус, по преданию, молился.

И, конечно же, нельзя, приехав в Израиль, в Иерусалим, не посетить знаменитый музей Яд Вашем. Это мемориал, предупреждение и место преклонения перед памятью шести миллионов евреев -- жертв нацистского безумия. На площадке перед мемориалом высится тридцатиметровая колонна с высеченным наверху словом "цкор", что означает "помни". Внутри, в музее собраны тысячи фотографий и документов, вся история преследований евреев с 1933 по 1944 год. Каждое утро в одиннадцать часов после краткой церемонии здесь зажигается факел.

Если вам захотелось совершить па-

**(Окончание на 8-й стр.)**

*ЛЕТНИЕ ПУТЕШЕСТВИЯ*

## "ШОЛОМ АЛЕЙХЕМ! МИР ВАМ"

**(Окончание. Начало на 7-й стр.)**

ломничество по христианским святыням, то кроме Иерусалима, оно предусматривает посещение еще двух священных христианских городов Израиля: Вифлеема /место рождения Христа/ и Назарета /место жизни его с родителями/. Как правило, маршруты паломников пролегают также через Тверию /место крещения Иисуса Иоанном Крестителем/, Копернаум /место приумножения хлебов и рыб/, Галилейское море /место Нагорной проповеди/. Последнее удивляет туристов чудом -- потрясающим акустическим эффектом. Если стать и говорить в том месте, где Иисус произнес Нагорную проповедь, то речь слышна в радиусе сотен метров. Это место сейчас называется Горой Блаженства в связи со словами Нагорной проповеди /"Блаженны нищие духом..."/ и находится здесь Монастырь Блаженства.

А теперь мы отправимся к берегам Мертвого моря. Это уникальное место на земном шаре. Путь к нему долог и лежит через Иудейскую пустыню, которую можно пересечь на верблюде, пешком или на автомобиле. Когда вы подъедете, перед вами откроется необыкновенный пейзаж: соль и скалы, белоснежные солевые перешейки и образования, выступающие из воды как коралловые призраки. Этот регион планеты держит несколько интересных рекордов. Это, несомненно, самое малообитаемое место на Земле. Атмосферное давление, существующее здесь, является самым высоким по сравнению с другими точками земного шара. Уровень Мертвого моря находится на 400 метров ниже уровня Мирового океана, т.е. расположено оно на дне глубокой впадины. Глубина его достигает в отдельных местах почти 430 метров. Плотность воды его такова, что утонуть нельзя. Целебные же свойства ее невозможно переоценить. Сюда, в пустыню над Мертвым морем, ушла от иерусалимской роскоши древне-еврейская секта ессеев /II в. до н.э. -- 68 г.н.э./. Существует гипотеза, что Иисус встречался с ними /ессеями/. В этих местах было найдено около 600 рукописей. Они на тысячу лет древнее самых старых экземпляров на еврейском языке Ветхого Завета.

Ну как? Понравилось наше путешествие? Это только небольшая часть того, что вы сможете увидеть и к чему сможете прикоснуться, если в следующий отпуск отправитесь на землю обетованную. А если вам посчастливится встретиться там со своими старыми друзьями, как это случилось со мной, или приобрести новых, то это сделает ваше путешествие незабываемым. Навсегда в вашем сердце останется память о гостеприимстве людей, живущих на этой земле, их доброжелательности, умении радоваться жизни, а также слова, которыми здесь встречают и провожают всех: "Шолом алейхем! Мир Вам!"

**Г.ГАТАЛЬСКАЯ,**
**преподаватель кафедры психологии и довузовской подготовки.**

---

**Спорт**

## ХТО Ж ДАПАМОЖА?

Зусім нядаўна ў штабкватэры Міжнароднай федэрацыі гандбола ў Вене адбылася жараб"ёўка розыгрышаў еўрапейскіх кубкаў. Наша жаночая гандбольная каманда "Універсітэт" у барацьбе за Кубак уладальнікаў кубкаў Еўрапейскай федэрацыі гандбола ў 1/16 фіналу сустрэнецца з камандай "Пелістэр" горада Бітола з Македоніі. Першая сустрэча адбудзецца ў Гомелі 7 або 8 кастрычніка, а адказная -- 14-15 кастрычніка ў Македоніі.

Аматараў гандбола, натуральна, цікавіць, як праходзіць падрыхтоўка нашай каманды да такіх адказных спаборніцтваў? Галоўны трэнер каманды заслужаны трэнер Беларусі Валерый Крукоўскі расказвае:

-- Наш трэніровачны рэжым вельмі насычаны, каманда трэніруецца два разы на дзень штодзённа, акрамя нядзелі, а гэта па 4-5 гадзін на дзень.

Што ж датычыць праблем, то іх шмат: цяпер трэніруемся ў спартыўнай зале ГДУ, а гэта не адпавядае ўзроўню міжнародных стандартаў, а іншыя спортзбудаванні горада не гатовы да новага спартыўнага сезона. Як я ўжо казаў, нагрузкі гандбалісткі пераносяць вялікія, а ў камандзе няма ні масажыста, ні ўрача.

Для паспяховай падрыхтоўкі нам неабходны міжнародныя сустрэчы і турніры. Мы запланавалі матчы ў Маскве і на Украіне, але яны адбудуцца пры ўмове, калі будуць грошы, а іх пакуль няма.

Цяпер з каманды пайшлі чатыры ветэраны. Некалькі выхаванак мы запрасілі з Гомельскай СДЮШАР-10, і адна гандбалістка прыехала да нас з Гродна.

Да гэтага дадам, што нашы праблемы пакуль застаюцца з намі. Гарадскія ўлады толькі спачуваюць. А наша ж каманда будзе прадстаўляць Гомель на міжнародны арэне.

**Віктар МАРЧАНКА.**

---

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ**

аб'яўляе кокурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

-- нямецкай мовы -- выкладчыка;

-- рускай літаратуры -- старшага выкладчыка;

-- геаграфіі -- старшага выкладчыка.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней 1 месяца з дня апублікаванага паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699 г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

---

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул, Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.

Рэгістрацыйны № 221

Спонсары газеты -- НВП "Сучасныя тэхналогіі", прафком студэнтаў.

Газета набрана і зверстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, аддрукавана на Гомельскай фабрыцы "Палесдрук", г.Гомель, вул.Савецкая, 1.

За няякасны набор, вёрстку і памылкі фабрыка "Палесдрук" адказнасці не нясе.

Рэдактар Ул.П. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.500 экз.
Заказ 512
Падпісана да друку 15.09.95.